Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., **на 1** мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.—4 р. на 6 мес.—2 р. **3 мес.—1** р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна также падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 8 Мая 1914 г. № 18

## Будзьця цьвёрды.

«Чым далей у лес—тым болей дроў» — кажэ прыказка. Гэтак і у жыцьці палітычным, грамадзянскім і моральным Расеі: чым далей правіцельство і кіруючые партіі ідуць у старану рэакціі — тым болей набіраецца фактоў цёмных, дратуючых душу кожнаго чыстаго чэлавека. Робіцца цяжка жыць у густой, перапоенай чэлавеканенавісьнічэствам атмосфэры.

Колішняе яснае, чыстае, скромнае, а вялікае і сьвятлае,—грубіянска аткінута цяперашнім дзікім, бязстыдным у свaей грубасці...

Трэба асаблівых часоў і варункоў, каб нарадзіліся такіе «государственные» людзі, кіраўнікі грамадзкіе, каторые-бы важыліся з Думскай трыбуны плюнуць усяму чыстаму у душу і выхваляць і пропагаваць шпіонства, сышчыцтва як, гэта зрабіў апошнімі часамі Пурыш-кевіч.

Запраўды асаблівые перэжываем часы.

А таварыство Філарэтчыкоў?

Ганьба, ганьба!

І вось, у кім ешчэ гарыць душа; каго гразкае балота панурай сучаснасці не засмактало, хто ешчэ не ўтраціў веру у добрае-вечнае—у гэты страшные часы,—не гасіця, не хавайця сьвяцілень сваіх! Усё благое, сучаснае, як чорная хмара праміне і настане ясны дзень.

Адно толькі каб вытрываць! Адно толькі, каб цьвёрда стаяць і благое—благім, а добрае—добрым называць не хаваючыся.

Не хаваючыся, браты, ваюйця с кожнай няпраўдай, с кожным брыдкім паступкам.

Шануйця імя сваё чэлавеччэ і непападайця у рабство—няволю духа. Нявольніцтва — гэта найвялікшы непрыяцель праўды і справядлівасці...

Сьмела і аткрыта ніхай кожны бароніць сваіх, справядліва належачых яму правоў і праўда запануе на сьвеці.

Але у вайне з ворагам паступайця справядліва і ні малога, ні вялікаго яму належачаго не пажадайця і не давайця свайго.

Бо хто ня ўмее бараніць сваіх правоў, той раб і нявольнік з духа і ня верця яму, бо ён можэ стацца зраднікам.

Будзьця цьвёрды у праўдзе і справядлівасці, і у адстаіваньні належачаго вам.

А гэтак пастпаючы зробіця слаўным імя сваё і збудуеця сьветлую будучыну тым, што па вас настануць.

**Юры Верэшчака**

## Пара ладзіцца да выбароу у земствы.

Тры гады таму назад у шасці губэрнях: — Вітэбскай, Мінскай, Могілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай, — адным словам у трох беларускіх і трох украінскіх губэрнях. — было заведзено так званае куртатае земства. Гэта значэ земства з аграніченьнем у правох мейсцовых жыхароў і з высокім выборным цэнзам. Дзякуючы гэтаму, тут у земствах перэважаюць ня тые каторых найболей працуе на зямлі і каторым земскіе справы рупяць, значэ селяне, а тые перэважываюць, каторые багацей і каторым законам абаспечэна з гары мейсцо ў земстві. Дзеля гэтаго земствы у гэтых губэрнях болей думаюць аб «патрыотызме» а земцы аб чынах і ордэнах, як аб канечных і пільна патрэбных справах вёскі, зямлі і яе жыхароў.

Праўда, па цяперашняму закону, у паветовых земскіх управах заседае па 12—15 чэлавек выбарных ад селян, так званых «бацькоў» вёскі, але як дагэтуль іхняго «бацькоўскаго» голасу у абарону селянскіх інтэрэсоў не чуваць было: яны, бедненькіе, цягнуліся за панамі і рабілі тое, што ім паны загадывалі. Грошы на земства, збіраюцца с селян і калі проста, бяз хітрыкоў, разсудзіць, то хто болей дае грошы, таго і голас павінен быць зычнейшы, а не наадварот. А па нашых земствах дагэтуль дзелалося якраз наадварот. І гэта дрэнна.

Земства у шасці губэрнях выбіраюць 22.500 000 руб. грошы, значэ па 1 р. 15 к. з душы, і с кожнай селянскай хаты у 6 душ трэба плаціць земскіх павінасьцей каля 7 руб.

Грошы гэтые ідуць у земствы, і земствы самі распараджаюцца, што з імі рабіць. Грошы можна і сюды і туды пакіраваць: можна выдаць іх так, што будзе селянам карысць і можна выдаць так, што селяням ня будзе карысьці, а толькі шкода.

А пойдуць грошы на шкоду селянам-беларусам, калі земствы будуць займацца абрусеньнем старонкі, калі будуць выдаваць на «патрыотычные патрэбы», а не на папраўку дарог мастоў; на будоўлю школ, бальніц ды на цьму іншых патрэбных нашай вёсцы і нашаму селяніну-беларусу спраў.

Грошы нашаму селяніну дабываць ня лёгка, ды мусі і дужа ня лёгка, калі па іх трэба ехаць ажно за морэ... Вось і павінны селяне навучацца цаніць гэтые грошы. Выдаючы іх, павінны ведаць на што яны пойдуць — на шкоду ці на карысць.

У гэтым гаду канчаюцца поўнамочыі старым выбарным і летам будуць новые выбары гласных у земствы. Во цяпер і павінны беларусы-селяне падумаць ды памяркаваць, каб выбраць у земствы людзей крэпкіх, стойкіх ды развітых, каторые-бы ня толькі віталіся за руку с панамі ды сядзелі на заседаньнях у земствах, але каб, яны ў патрэбі патрапілі бараніць-селянскіх беларускіх спраў. А спраў важных у земствах многа: там і разбіваюць, хто сколькі мае плаціць павіннасьцей, куды і на што пойдуць сабранные грошы і ўсякая ўсячына.

Выбары гласных у земствы дужа важная справа і яе нельга

## ГУТАРКІ.

### Праўда.

Так спрэчаліся людзі паміж сабой:

— Быць ня можэ, каб гэты чэлавек мог толькі заўсёды і заўсёды праўду гаварыць!? Шак-ж бывае такое, што, каб добра было, каб хоць напрыклад, чэлавека ад голаду, ці ад сьмерці выратаваць — то трэба зманіць перад людзьмі. Мне здаецца, што такая мана павінна называцца праўдай... Мо гэты ваш «праўдзівы» і робіць так, — толькі вы не зразумелі яго?

— Але дзе там! — адказваюць другіе. — Заўсёды і заўсёды праўду кажэ. Напрыклад сягоньня, вось як самі ведаеце: сын яго Януль, такі ціхі, такі працавіты і багамольны здаецца, за бацьку свайго жыцьцё гатоў аддаць — а вось трэба было такога здарэньня што у Пранука сьвіран чамусь быў адчынены; Януль гэта шусь туды, дый цэлы бок саланіны і сцягнуў. Пранук, ведама, зараз сюды, туды — давай шукаць. А за сялом у лясу цыганэ стаяць. Ён да іх. Там на аднаго цыгана паказалі. Зараз гэтаго цыгана у воласць, ды у халодную. Толькі гэта ужо сабраліся каб злодзея атапам да прыстава гнаць, аж тут як з зямлі вырас «Праўдзівы» і: так і так, кажэ, гэта мой Янулька украў гэту саланіну. Бярэця яго, а цыгана пусьцеця. І заплакаў горкімі сьлязьмі: Дабра я не бачу ад праўды сваей; майго Янaчку, майго адынаго забяруць!—Плачэ стары, а сам выдаў яго.

— Неразумеім, — кажуць трэйціе, — як гэта можна купіць волю цыгану-валакіце скурай сына роднаго. І любіць шак-ж ён яго,— ня то што, каб не любіў...

— Такі ужо урадзіўся, такая яго доля, мусіць! Ці адно такое здарэньня сягоньня? Кожны раз, так і чуеш, што свой нос у шчыліну «Праўдзівы» усадзіць, няведама на што па што і за чужых, няведама якіх людзей.

— А ўсё багацьце яго дзе падзелося? Шак якое яно, багацьця значыць, па бацьцы сваім нябошчыку дасталося яму? — а ўсё людзям вярнуў, бо:—даведаўся я, кажэ, што няпраўдай у судох высудзіў яго, бацька мой...— І так астаўся цяпер голы, як галён той.

— Гэта што,—вырвалася нейкая баба лепятуха, — вось я вам не такое скажу. Ці ня чулі вы, што ён, гэты самы «Праўдзівы», ня тут кажучы, у катарзі быў!? Не!? А-е-е-е! Мае вы людцэ, Мае вы даражэнкіе! Дзівіцца трэба чаго гэты чэлавек за сваю дурную праўду ня вынес! Не жартачкі! Маці Божая, Іезус Сьвяты! — у катаргу за такое глупства чэлавека заслалі. Так было: жыў тутака у сваім маёнтку граф N—скі. Усе людзі да яго на работу хадзілі. А сам пан N надта ужо да баб ласавіты быў; убачыць якую прынароўную маладзіцу ці дзеўку — зараз да сваіх пакоеў. Збавеньня ад яго не было; сколькі мужыкоў і матак праклінaлі і плакалі, сколькі дзетак па сьвеці жэбракамі пайшло. Але ніхто ня мог нічога парадзіць.—Зачапі такога пана! Дзеж,— жартачкі — з міністрамі кампаньню вядзець, князе да яго у госьці прыежджаюць... Ніхто не адважыўся канца на яго шукаць. Толькі адзін «Праўдзівы» неяк за адну дзеўку заступіўся і ў суд падалі. Граф мейсца сабе ня знойдзе, як сшалеўшы лётае... Казаў усім да аднэй душы к яму у двор сабрацца і кажэ: Я вас усіх як мятлой у Сібір закатаю, калі хоць адзін сабака на судзе проці мяне стане і за праўду прысягне! Бэбахі вашы павытрасаю! С торбамі пушчу!..—Ведама, штож: прыйшоў суд, тая самая дзеўка, дастаўшы каліту грошы, сказала, што графа і бачыць ня бачыла — зрэклася, значыць, дурной прыкінулася. А «Праўдзівы» і узяўся тут даводзіць: што яна падкупленая і што ён тысячу выпадкаў ведае, як граф с кабетамі абходзіцца, што сколькі людзей плачэ. Не дарую кажэ, ўсё роўна. І ўсе, кажэ, пасьведчыць павінны. Сталі пытацца сьведкоў. Пасьля прысяга пайшла і усе паказалі: Знаць не знаем, ведаць ня ведаем і яго аднаго, галубочка, на 10 гадоў катаргі за фальшывую прысягу значыць..

І многа, многа ешчэ іншых рэчэй пачалі разсказваць людзі адны адным аб «Праўдзівым» чэлавеку.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

...Пасьля людзі гэта казаць пачалі:

— Мала такіх справедлівых у нас ёсць. Каб усе такіе былі, або хоць палова такіх было, нават, каб і меньшая часць такіх было,— ужо была-б *сіла*.

— Э-э-э! Ён зноў сваё пачаў! Хто такі дурны будзе, каб сына на цыгана праменяць, або сваё багацьце няведама за што людзям пааддаваць, або каб людзі яму у вочы плевалі, а самому цягацца цяпер як тая курыца намочэная?..

Ці многа вас такіх знайдзецца?!

### Шалёны.

Шалёны яго у нас празвалі.

Хоць так сабе ён ніштo: і сьвітка на ём такая самая, белая, і ў хаці яго жонка і дзеці ня горш, як у людзей, і з людзьмі тымі самімі ён, як чэлавек, жыве ня згорш. Нават у маскалёх служыў і вярнуўся с трымя трынчыкамі на апалетах,—унтэр-афіцэрам, значыцца. А пасьля і сьвету зазнаў за хлебам ганяючыся: у Амэрыцы быў і у нямецкай зямлі быў і ешчэ дзесь за нейкім морэм быў. А цяпер, вось, ужо многа гадоў, як сядзіць ён у свaей вёсцы і думаць ня думае, каб куды на якіе заработкі ехаць. Бо праўду сказаць, у хаці яго ня Бог ведае якіе дастаткі, а так, як і у кожнаго ёсць хлеб—да хлеба; кароўка ёсьць адна, канінка сівая, каб так-сяк свой шнурачак абгараць і абсеяць...

абы чым збываць, да гэтых выбароў трэба аднасіцца удумчыва, трэба загадзя надумаць кандыдатоў, трэба загадзя ураіцца чаго яны павінны вымагаць для селян ад земства. Адным словам селяне перад выбарамі павінны назначаць сабраньня і на іх ураіцца каго такога паслаць у земства гласным, хто не пабаіцца выступіць на земскіх сабраньнях у абарону беларускіх селянскіх спраў і патрапіць іх атстаяць. Хоць гласных селян і меней у земствах як паноў ды чыноўнікоў, але калі будуць гэтые людзі цьвёрдые ды дружные, то яны заўсёды патрапяць атстаяць свае селянскіе справы і зрабіць многа карыснага для беларускай вёскі.

**Земец.**

## Вотклік з вёскі.

Вялікая радасць агарнула маё сэрцэ, калі прачытаў у 9 № «Н. Н.» вестку аб беларускай вечарынцы 9-го лютаго у Вітэбскім Вучыцельскім Інстытуці. «Селянін беларус загаварыў са сцэны аб сваім горкім жыцьці і думках, «паны» былі здзіўлены, што наша песьня ні чым ня горэй ад украінскіх і велікарускіх». Ды запраўды як жэ ж не дзівіцца «панам»? Што у вёсках жывуць «мужыкі», носюць шэрые сьвіткі, лапці, многа пьюць, брыдка лаюцца і інш. — ведаюць усе. Душы ж гэтаго гаротніка, яго думак, пачуцьця — ніхто не уцяміў, нават і не дагадваўся, ці ёсць гэта у яго! У вёсцы пачуў гэту песьню — эт, вядома мужыкі, а то у Інстытуці са сцэны!?

Лунае песьня, бье у вушы пекнымі звароткамі, напаўняе сэрцэ страшэнным жалям гаротніцкай долі, як у люстры атбівае яна таго, каго ужо даўно палічылі нябошчыкам, чыя кроў цячэ у большай частцы тых «паноў», што прышлі паслухаць (мо і чужынцы былі?). Яны (большая частка) саўсім нідаўна пакінулі вёску.. І здзіваліся. Не віталі горача, не падхапілі сваімі голасамі роднай песьні «каб аж сьцены задрыжэлі», каб аж за межамі роднай старонкі пачуўся гучны вокліч, да чужынцаў даляцеў ды пачулі яны, як родные сыны Беларусі пяюць яе сумные песьні, і толькі здзіваліся!.. З здзіўленьням прыслухоўваюцца, калі са сцэны пацягнула вёскай роднай: зашоргаў серп па жыцейку, заблішчэла на балоці каса, пачуўся гоман начлежнікоў ля вогнішча, матка заплакала ля калыскі хворэнькаго свайго сыночка, шле жальбы разам з праклёнам на сваю долю сестра, што цяжка жыць за нялюбым, а «паны», ідучы дамоў дзівіліся, як дзівілася Сейлавіцкая вучыцельніца, калі пачула ад вучнёў: могілкі, плот стрэльба і др. незразумелые для яе словы, што прасіла «лапатку», а ёй далі лапату хлеб у печ саджаць, просіць цыбулі — не разумеюць!. Цікава: бацькі не разумеюць сваіх дзяцей, дзеці дзіву даюцца, калі пабачылі пекнасць матчынай песьні са сцэны Інстытуту!..

Кажуць «душа дзіцяці — воск, на якім усё напішэш». Але што іншае бачым у жыцьці. Песьцяць сябе бацькі уцехай, а сынкі і дачушкі зракуцца свайго роднаго ды брудам кідаюць у вочы замест падзякі. Толькі цяпер я разгадаў загадку нябошчыка дзеда: «што гібчэй заўсё». «Дубец спраньжына»—не, кажэ Чалавечэ сумленьня, дзядулька, яно куды ямчэй за ўсё: гнецца ды злашча, у тваіх унукоў!..

Зрабілося радасна мне ня с тэй прычыны што «паны задзівіліся ды згадалі розум селяніна, а што ёсць верные сыны сваей дарагой бацькаўшчыны Голасна гукнулі маладымі голасамі са сцэны Інстытуту хто яны, не згубілі сумленьня, не счураліся сваей мовы. Прэдстаўнікі вёскі, якім шчасьце усьміхнулося піць сьвятую асалоду навукі, ня гонюцца за шклянкай салодкай панскай гарбаты, не адварочываюцца ад цёмнаго брата, а прапягіваюць яму руку, не ганьбючы мазалёў. Сваім вечарам яны паказалі што і у нашай старонцы ёсць людзі, якіе не ідуць чорным шляхам на зніштажэньня душы свайго народу, а маюць і сваю думку, ясна адлічаюць у дзікім ляскаьньні аграмаднай таўпы воўкалакаў і свой родны шлях! Яны добра уцямілі, што беларус мае сваё жаданьне, хочэ жыць па свойму! Бо добра відаць, куды вядуць нас сябры—«паны», і мы павінны сказаць ім: «бывайце ўжо здаровенькі». Ім трэба салодкае сваё жыцьце запіваць нашай кроўю а мы хочэм жыць, ды жыць с пачуцьцем сваей нацыянальнай свядомасьці, глядзець сваімі, вачыма, а не праз іх «панскіе» вакуляры! Мы хочэм, каб кволые душы нашых дзетак не пэрэбіралі бруднымі рукамі, някідалі туды бруднай ненавісьці да таго, чыя кроў у ім цячэ! Пакіньце рупіцца аб нас, нам павадыры ужо абрыдлі! Дайце нам вольна карыстаць са сваей працы, не душыце нас, дайце напіцца усім с тэй крыніцы, што забіла у нашым народзе, не паганьце не кідайце туды свайго «панскаго» бруду! Бярыце сабе тых пэрэкінчыкоў што чорнай вопраткай і гвездамі адгаро жываюцца ад бацькоў! Мы зрэкаемся іх, бо яны сваю мову перэмянілі на «панску», **бо хто згубіў мову — згубіў і сваю нацыянальнасць!** Мы патрапілі самі запаліць агонь ды асьвяціць свае пацёмкі!..

Вот браточкі, як адбіліся вашы сьпевы у цёмным куточку роднай зямелькі Шчыра вітаю вас!.

Усе вы, скончыўшы навуку, разойдзецесе па ўсей Беларусі, дык высока дзяржэце праўдзівы сьвет у руках: цемрач збаіцца яго! Цераз вашы рукі пяройдзе многа вясковых дзетак, дык загаманецяж да іх зразумелай мовай, закіньце ім у душы добрые зерняты, навучэце любіць і шанаваць сваю старонку, сцеражэце дзецкае пачуцьце! Ніхай хацця іх доля закрасуецца, усьміхаецца сваім шчасьцем... Во шкада, калі чорные хмары агорнуць і іх, захістаюць навальніцы з градам... Жудасна робіцца ад думкі, калі і іх чэкае бацькава сьцежка.. Няўжож і яны будуць бачыць толькі здзек, руіны сваей бацькаўшчыны? Няўжож і яны завянуць, заглушыць іх бруднае зельля, памруць не спачуўшы гымну жывой Краіне?.. Даложэцця, родненкіе і свае рукі да здабыцьця лепшай будучыны, памажэцця зваеваць нядолю!..

**Зрэбны.**

## Атступнік.

Дажывае стара маці,
Сірацінаю у хаці
Ў соннай волі, ў чорнай долі,
Як та груша сярод поля.

Мела сына, але сыну
Захацелося ў чужыну:
Ён пайшоў шукаць там шчасьця,
Або згінуць, запрапасьці.

Мела дочэк, але дочкі
Пабрылі так сама ў прочкі:
Тая замуж, тая ў службу
На нядолю на нядружбу.

*

Дажывае веку маці,—
Ўжо ня можэ з ложка ўстаці;
Клічэ дочэк, клічэ сына,—
Але пуста ўсё хаціна.

Сабраліся добры людзі,
Гаманілі: што-то будзе:
Са старою мала ладу—
Трэба даць якую раду.

І да сына пісьмы пішуць:
—Прыежджай, бо ўжо чуць дышыць
Маці стара і маячыць:
Цябе хочэ ўсё пабачыць.

*

Сын варочаўся с чужыны
Да матулі да хаціны
Ніто князям, ніто панам,
Ніто трэзвым, ніто пьяным.

Падыйшоў да ложка бліжэй:
Маці сьпіць, як знята с крыжа;
Пахіліўся над ёй нізка,
Як яна здаўн над калыскай,

І старую разбуджае,
Нейкім словам пацешае, —
Штось гаворэ і гаворэ,—
Тая слухае, як зморы.

---

Больш нічога німае «Шалёны».—Грошы і не пытайся — не прывёз с чужой зямлі.

— На што мне, кажэ, грошы—ня грошы чэлавеку патрэбны, а душы збаўленьня! Грошы гэта і ёсць той самы чорт, аб каторым сьвятое пісаньне кажэ, каторы душы нашые у пекла цягне! Чэлавеку патрэбны корм духоўны і ён не павінен есць хлеба с коласа працы сваей... Чэлавек створэны ад Бога ад Бога мае свой пачатак Бадай што чэлавек і ёсць Бог—і есьці яму ня трэба... Ем я яго да пары, да часу, пакуль здужаю у сабе хваробу, што *хваробай чэлавечнасьці* называецца. А прыйдзе гэты час і ня буду есьці .. Ха-ха-ха, вы сьмяецёся — і я сьмяюся! — Ведама, што «Шалёны» скажэ, то трудна зразумець.— Есьці я павінен і буду есьці хлеб с коласа працы сваей, — але праца для хлеба с коласа павінна быць, во, такой маленькай, як тая зорка на небі, а праца для хлеба духоваго, для душы збаўленьня — значыць, — павінна быць такой вялікай, як гэтае сонцэ на ўсходзі..

Так часамі «шалёны» казаў людзям, калі у яго пыталіся. Чаму ён такі?.. Але цяпер рэдка гаворыць ён з людзьмі.. Ходзіць самотны, задумлённы. Галава ледзь не нагрудзях легла, а вочы блішчаць, як у воўка.

І дзіўна: калі-б ён ня йшоў праз вёску,— ў дзень, ці ў ночы, дык ніводзен сабака на яго ніколі не забрэшэ... Нават, на што ўжо Юркаў, «Рабка», як зьвер — такі ледашчы: колькі людзей пакалечыў; нікому спуску ні дасьць, — а ідзе «Шалёны», дык і раззявіцца ня думае: галаву спусьціць і хвастом круціць пачне, а «Шалёны», тагды, неяк соладка ўсьміхаецца да сабакі...

Людзі так сама не чэпалі яго, толькі за вочы, паціху шэпталіся: — Бач, — шалёны пайшоў...

Праўду сказаць, і дзеці у яго нейкіе, бадай што такіе самые, як ён, здаецца: ні ў гульні з другімі іх ня ўглецзіш ні пры рабоці яны не вясёлые, ні ў цэркві багамольные...

І ня дзіва, бо колькі разоў бачылі яго, што: пасадзіць, гэта ён усіх у садочку сваім пад бярозкай пры сонца захадзі і пачне навучаць па своему, і пачне.

Дзеж?—і зорка, часамі, на небі пагасьне тагды толькі скажэ «шалёны»:

— Ну, хіба, што пара табе Міхась быдла ў поле гнаць і мне на ніўку ехаць. Вы Андрэйка і Марыля засьнеце крыху, а пасьля мацеры што пры хаці паможэця! . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . . . . .

### Хаўтуры.

Нідаўна мы пахавалі усім сялом дарагога нам чэлавека. Хаўтуры справілі як мае быць, бо не было такога, каторы знаў яго і каб не плакаў, як дзіця. Ен жыў апошнімі часамі у нашым сяле. Калісьці, як кажуць, ён тут і радзіўся, тут і гаспадарка у яго дзядоў і бацькоў была. Ды толькі, як мінула яму значыць, 15 гадкоў, падвучыўшыся крыху, паехаў ён у горад ешчэ болей вучыцца, — бо надта (помнюць ешчэ старыкі нашы) любіў ён уселякіе кніжкі чытаць і песьні перапісываць. Але як паех аў, дык ніхто і не бачыў яго, пакуль, бадай што, старым ужо чэлавекам у нашэ сяло не вярнуўся. Вось, Капшукоў Андрэй пасьля пахарон гэтаго чэлавека, разсказаў: — Я добра, кажэ, знаў бацькоў яго. Добрые былі людзі, вельмі добрые. Дзяцей у іх не было, апрыч яго аднаго, а гаспадарка ня дрэнная, жылося ім ня згорш,—дык і любілі яны дзіцятка сваё. Помню добра, як сягоньня: прыходжу гэта я да іх, каб пазычэны авёс аддаць. Гаспадара у хаці не было: у горад паехаў. Гаспадыня вячэру варыла, а малы гэты (меў тагды 5 гадкоў) учапіўся, жэўжык, за андарак мацеры і пытаецца:—«А якога гасьцінца татка прывязець?» — «Абаранкаў»—кажэ маці. — «Еш сама абаранкі, — кажэ,—я не хачу. Ніхай татка кніжку прывязець!» І пачаў плакаць. Як на тое і бацька ўходзіць,—прыехаў,—значыць. «Чаго ты, кажэ плачэш сынку?» -«Бо я не хачу абаранкаў, я хачу кніжку». — «А мой ты сыночэк, а мой ты такі і гэткі.—цешыцца бацька,—я-ж табе казаў, што прывязу і прывёз. На!»—выняўшы лемэнтар з малюнкамі падаў маломý.

Я вам кажу, што толькі самім трэба было быць у тую пару і бачыць, бо я сказаць не патрaплю, як тое дзіця цешылося і з усіх канцоў цэлавало тую кніжку..

Дык вось; ён у нашым сяле жыў апошніе часы перад сваей сьмерцьцю той самы жэўжык, — толькі быў ён саўсім ня жэўжык, а чэлавек гадоў пад сорак, паважны і горды, ды ешчэ, вельмі мяккога сэрца, такога мяккога, што здаецца папрасі яго, дык апошнюю кашулю аддасць. Кніг было у яго уселякіх, ды, во скольки,—поўная хата! І так сама усё чытаў, і чытаў. Праўда, ён вельмі любіў, калі хто прыйдзе да яго. Тагды ён весялей неяк і пачынаў гутарку. Часамі гаварыў ён аб тым, як ён вучыўся, як служыў, як пасьля яго за нешта у вастрог на доўга пасадзілі, якіе людзі на сьвеці... Як пачне, як пачне, дык і забудзеш, што даўно да хаты пара; а як выйдзеш ад яго, бывала, то так, здаецца, як пасьля споведзі, хоць сам нічога не гаварыў, а толькі ён усё, але лёгка стане на сэрцы табе, што хоць на дварэ бывала і мароз, а ідзеш, і здаецца, што усё зацьвіло, што птушкі прыляцелі, што ўжо весна наша прышла..

Аднаго разу мы з ім аб хаўтурах гаварыць пачалі, дык ён вось якое расказваў:

— Калі я памру, дык пахавайця мяне проста, зусім проста,—бо як быў я, кажэ, па ўселякіх вялікікіх гарадах, то многа чаго бачыў, як самі ведаеця і праз тое прашу вас,— пахавайця мяне проста. Дык слухайця-ж,— казаў ён далей: Быў я ў адным такім вялікім

*

Прыглядаецца матуля,
Што зрабілася с сынуляй:
Ён, ці не—стаіць у хаці,
Усё сіліцца згадаці.

І згадала, ой, згадала,
Енкнуць голасу сабрала,
Бы та каня над крыніцай:
—Чужаніца, чужаніца!

Легла маці ў дамавіну;
Сын зноў ехаў у чужыну,
А за ім шумелі людзі:
Што-то далей з яго будзе?!.

**Янка Купала.**

Вільня 22/II 1914.

## Араты.

З гора сьпеваючы песьню маркотную,
Лейцы ў руках мазалістых трымаючы,
Ціха ідзе ён за сошкай сагнуўшыся,
Долю сваю тут у полі шукаючы.

Конік старэнькі чуць цягне дрыжачую
Матку-кармільніцу, сошку дрэўляную,
Сам-жэ араты наш ею кіруючы,
Шчыра ўзрыхляе зямельку жаданную.

З горкай нудою нідзе не разстаўшыся.
Шчасьця век цэлы у полі шукаючы,
С сошкай крывенькаю, с коскай сталёваю
Ходзіць, марнеіць, свой пот выліваючы.

**М. Ландыш.**

## Аб усім па троху.

### Даўно вядомае.

Як вядома Пурышкевіч лічыць усякі сыск патрыотычнай справай. Гэта ён абвесьціў нават з Думскай трыбуны. Я даўно пахаваў пачуцьце фальшываго стыда,—казаў у сваей прамове Пурышкевіч,—і цяпер разам з маей партіей маюся заняцца сысчыцтвам...

Калісь на страніцах гісторыі гэты сказ адмецюць будучые гісторыкі і каб падчыркнуць «дух часу» скажуць:

— Дэпутаты,— напішуць яны,— ішлі тады у сышчыкі, а сышчыкі выбіраліся у дэпутаты..

Мы аднак слухаем такіе гутаркі са сьмехам, бо кожны з нас сучасьнікоў, ведае, што правае крыло расейскаго парлямэнту упіраецца у «ахранку», а левае—у катаржные работы.

### Літоўскіе друкі.

Першым друкам, пасьля скасаваньня забароны на літоўскіе друкі, быў атчот тэльшэўскай харчавой крамы, пазволены цэнзурай 23 чэрвеня 1904 г.

2 грудня 1904 г. Антон Смільго атрымаў пазваленьне на выдаваньне літоўскай штотыднёвай часопісі «Lietuvių Laikraštis» (у Пецярбурзе). Першы нумэр выйшоў 18 грудня 1904 г.

12 кастрычніка 1904 г. у Вільні П. Вілейшыс аткрыў першую літоўскую кнігарню.

10 грудня 1904 г. у Вільні выйшоў першы нумэр. першай літоўскай газэты «Vilniaus Žinios». Таго-ж чысла выйшоў у Вільні і першы нумэр літоўскай тыднёвай часопісі «Lietuvos Ūkininkas».

29 студня 1905 году, Наўяліс аткрыў першую кнігарню літоўскую у Коўні.

1 сьнежня 1905 г у Вільні выйшоў першы нумэр дэмократычнай літоўскай газэты «Lietuvos Ūkininkas».

Ад 1904 г. за 10 гадоў усяго вышло 2540 літоўскіх друкоў у 5,015,000 экзэмплярах.

Па рахунках літоўскіх кнігарэнь, яны прадалі розных літоўскіх друкоў у Вільні на 71.000 р.

Цяпер у Расеі выходзіць 25 літоўскіх часопісоў у гэтым ліку у Коўні — 10, у Вільні—8 у Рызе і Сэйнах па 3 у Новым Месце -1.

Ад 1904 г. закрылося 17 газэт, у гэтым ліку у Вільні 11.

### Статыстыка забастовак.

У 1913 г. баставало с палітычнай мэтай 826.000 работнікоў, з экономічнай мэтай бастовало 1.124.985 душ. Страты фабрыкантоў ад забастовак аблічаюць на на 1.274.000 р. Страты работнікоў на 2.784.000 руб.

## Агляд кніг.

Наша літэратура адрэзу збагацілася пяцьцю новымі кніжкамі. Чатыры - з гэтаго ліку — вышлі коштам «Беларускаго Выдавецкаго Таварыства у Вільні», а пятая — «Вілікодная Пісанка».—часьцю са складак. чытачоў «Н.Н.», каторые адгукнуліся і зложыліся на часць, (трэцьцюю) коштаў друку і паперы

Факт гэты, што чытачы нашы, ня толькі людзі, што жывуць у краю, але нават палітычные ссыльные пасьпяшылі адгукнуцца і палажыць свой гаротны рубельчык на агульную справу, адмечаем з гордасцю. Бо гэта добры знак, — таго, што расце у нас пачуцьце грамадзянскай павіннасці, расце грамадзянская сьвядомасць, знак, каторы кажэ што у патрэбі і мы патрапім тварыць вялікае грамадой; знак што справа беларуская горача рупіць лепшых людзей і што тые людзі беларускую справу лічуць сваей і, чым дужы, гатовы памагаць ей.

1) **«Вялікодная Пісанка»** (80 стр. 8⁰, ц 25 к.) разсылалася пры № 16 «Н. Н.» усім падпісчыкам і са зместам яе нашы чытачы ужо, мабыць, пазнаёміліся Найболей мейсца у кніжцы занялі дзьве стацьці аб беларускім руху: Л Гмырака і М. Горэцкаго.

Абедзьве стацьці разбіраюць беларускае національнае адраджэньне і даюць цэнны матэрьял для кожнаго, хто ня здолеў дагэтуль пазнаёміцца з гісторыей і цяперэшнім палажэньнем беларускаго руху.

Мы думаем, што парушэные у гэтых стацьцях тэмы погляды і думкі будуць ешчэ разглядацца і высьветляцца на сраніцах «Н.Н», дзеля таго, што багаты матэрьял аб беларускім адраджэньню (асабліва у XIX ст.) далёка ешчэ поўнасьцю ня выкарыстан. І, быць можэ, шмат што стане перэд намі у саўсім новым сьвятле. Ну, а развагі і думкі аб будучыне, аб творчай працы і дарогах яе, гэтак сама не пасьледні матэрьял да новых разваг і думак.

З бэлетрыстыкі увайшло не шмат чаго у «Вялікодную Пісанку», але ужо адну рэч — «Сабака і чэлавек» Бор—іча — усьпелі перэкласьці на расейскую мову і надрукаваць у газэці «Наша Волынь» № 110, 30/IV).

Аб рэшці ніхай самі чытачы судзяць.

2) **Ядвігін Ш. «Васількі».** (120 стр. 8, ц. 30 к.). Аўтор добра вядомы чытачом «Н.Н.»; аб «Васільках» абшырней пагаворым на іншым мейсцы. У кніжку увайшлі яго апаведаньня-байкі ужо друкованые у «Н. Н.» між іншым «Суд», «Важная фіга» і др.

3) **Я. Лёсік—„Ня ўсе-ж разам ягомосці“.** Аўтор, гэтым першым сваім апаведаньнем адразу завяваў сабе пачэснае мейсцо у нашай літэратуры. Трэба чытаць Лёсіка, каб бачыць усё багацьця яго фантазіі, красу яго мовы, знаёмасць жыцьця беларускаго, гарачае пачуцьцё да старонкі роднай. І ў кожным слові, у кожным звароце аўтор заўсёды сам сабой: наскрозь орыгінальны, індывідуальны і ўдумчывы. Кніжачка Лёсіка уводзіць чытача адразу у кіпучае вясковае жыцьцё і знаёміць с характэрнымі вясковымі тыпамі і пад прыкрыцьцем будзённаго, але цікаваго жыцьця, праз думкі карчомнаго папугая, вядзе чытача да тых мамэнтоў «калі дзесь на таёмнай глыбіне душы заварушыцца штось» і у Лёсіка гэтае «штось» ужо далёка не будзённае, а нешта глыбокае, што парушае «сакрамэнты душы людзкой».—«Мо горкі жаль адзіноцтва, а мо сьпевы чужаніцы пабудзілі змоўкшые песьні далёкай бацькоўшчыны і ўскалыхнулі пачуцьця роднай краіны»...

...Лёсік палітычны ссыльны.

4) **Apawedańnia i lehiendy wieršam.** (96 стр. 8⁰, ц. 25 к.). У кніж-

горадзі і хадзіў колькі дзён ужо нічога ня еўшы. Хаджу па вуліцы, а пагода мокрая, адліга, а боты мае на той час мелі вялікую «працекцію», як чыноўнікі кажуць.—Дзіравые боты былі. Іду я і думаю, што варта заглянуць у адну вёску, што ад гораду вёрст за пятнацаць была. Тымчасам прахаджу міма найвялікшаго ў тым горадзі касьцёлу. Бачу: калясак, — карэт, самакатаў нязлічэная моц, каля касьцёла значыць. Хіба хаўтуры нейкаго багача, думаю сабе, — дай зайду. Зайшоў у касьцёл, але там поўным паўно, ды як на здзіў; ані аднаго «шэраго» чэлавечка, як гэта павінна быць заўсёды, а тут усе паны ды пані такіе, што куды там. Здаецца аднэй парфумы пудоў с сорак было выліта на іх вопраткі,—так пахло... Нічога. Я сяк так праціснуўся, каб паглядзець, хто гэта такі нябошчык. Як даведаўся, то мне, аж нeяк дрэнна зрабілося. Нябошчык быў самы багаты у тым горадзі пан, каторы за ўсе жыцьцё сваё нікому ні словам ні дзелам, а ні на крышынку малую дабра не зрабіў, а толькі, як мог, то шкодзіў бедным людзям... Але што там! Усё роўна... Труна яго стаіць на высокай, на сажэнь так, цадбудоўцы аббітай чорным аксамі там с сярэбранымі берэгамі і крыжамі. Вянкоў найдаражэйшых з устужкамі розных колераў звалена на той гроб нязлічэная моц. А ўсё гэта абстаўлена, як лесам зялёнымі заморскімі дрэвамі. Усе сьвечкі і усе ліхтарні былі запалены. Ніхто не плакаў, ніхто не прычытваў. Толькі пры ўсіх трох аўтарах касьцёла стаялі на каленьнях ксяндзы і адгаварыўшы свае словы сьціхалі, а хор і арганісты тагды адказвалі ім і пачынаючы ціхім сьпевам, ды такім жаласьлівым і плакучым, што аж мурашкі праходзілі па скуры і валасэ на галаве рухаліся.

Вось — думаю сабе, — казаў ўсе ён, вечны пакой яму. — А як гэта памрэ жэбрак які, дык і без ксендза, без папа хаваюць, а часамі, то й крыжа на магілі німа яму. Добра, калі знойдзецца адзін які чэлавек, каторы за рубля якога труну купіць, а то і няведаю, як было-б?..

— Жалобная атправа тым часам ішла сваім набожным плывам і здаецца на крыльлях Анёлаў неслася душа ў Неба... А на тварах у некаторых людзей быўшых у касьцелі бытцым было напісана: Гэтаго нябошчыка во як хаваюць, а як гэта будуць хаваць яго дзяцей, нас. другіх?..

— Пад канец адправы на хорах раздаўся ціхі але чуць было, што гэта моцны і чысты голас аднаго чэлавека (solo) Голас гэты якбы усім вядомы, здаецца, перэмяніў твары людзей і расплываўся бытцым цудоўнай лёгкай хваляй па ўсім касьцелі і пасьля уліваўся у душу кожнаго —не мінаючы і тых прыслужнікоў касьцельных с сярэбранымі булавамі у руках і доўгімі вопраткамі перэпаясанных наўскась праз плечы шырокімі чорнымі ўстужкамі, бо і яны быўшые, да тэй пары, сурьёзнымі, думнымі — зрабіліся мілымі і прыятнымі. Адразу было відаць, што пеяў незвычайны касьцельны сьпевака, а найвялікшы і найслаўнейшы артыста таго краю. Пеяў ён доўгую малітву аб адхадзячай с цела душы і у песьні сваей прасіў і маліў Бога прыняць гэтую душу да неба. То голасна, то так лагодна, сьціхаючы, то зноў, узяўшы высокую ноту, паднімаў яе вышэй і вышэй, што здавалося, што ўсё гэта было не ў касьцелі, не на зямлі, а напраўдзі высока, высока, аж у небі, гдзе так лёгка грэшнай душэ чэлавека... Але гэта толькі здавалося чуючы сьпеў слаўнаго артысты, бо калі-б гэта было ў небі, то дзіўна нават, нашто тагды прасіцца да яго...

Я аглянуўся на хоры, пасьля на сотні галоў і бачыў, што не было чэлавека, каторы не выціраў выбіўшэйся сьлязы на твар.

Калі я выйшоў с касьцёла і стаў глядзець, як на адзін і на другі вазэ трыумфальные складвалі тые вянкі нябошчыка, а на трэйці стаўлялі труну яго — пачуў такую размову двох паноў гаварыўшых паміж сабою:

— Ня дзіва! Ксендзам 800 рублёў, прыслужнікам 100 рублёў, на сьвечкі і касьцёл 200 рублёў. Адных вянкоў калі злічыць хіба больш будзе як на 5,000 рублёў..

— А ты ведаеш, казаў другі пан,—колькі каштуе хор і гэты артыста, каторы пеяў так. Не? Братка ты мой! Хор то нічога, хор каштаваў толькі 900 руб. а артыста гэты узяў 13 000 рублёў! «Іначэй» —кажэ,—«не магу ісьці пеяць, мне сягоньня трэба пеяць у тэатры, я магу змучыць свой голас».—Як жэж! Я сам хадзіў нанімаць яго: 13.000 рублёў!.

Ня помню ужо добра аб чым я думаў тагды, бо апомніўся толькі, калі выйшоў за горад і убачыў другіе хаўтуры:

Мізэрная малая канінка цягнулася ледва ня ледва. На возі лежала белая труна з сасновых дошчак; за возам ішла бледная кабеціна ў абдзёртай адзежы і вела за руку аднаго хлопчыка гадкоў шасьці і нагрудзёх несла, як вілаць, другое, меньшае дзіцянё На твары яе бытцым замёрзлі дзьве слязінкі. Больш там нічога не было: Ні ксяндзоў ні папоў, ні людзей ніякіх, толькі праўда на адным канцы труны сядзеў вазьніца, а на другім лежаў крыж, такі самы белы як і труна тая...

І расказчык, кончыўшы расказ свой сказаў мне. Пахавайця мяне проста. А дабро маё, якое ёсць, дасьце таму у каго на хлеб, або на труну ня будзе...

**І. Шлінoў.**

ку увайшлі: «Роднае слово», «Шчасце»—Я. Купалы; «Сцяты камень» К. Каганца; «Матчыно прычытаньне»; «Вылечыў» — Коласа; «З заработкаў»—Янкі Сьветлячка; «Не спанатрыў», «Год Беларуса», «Тры злодзеі». Кумоўскіе магілкі», «Цікавы»—Старога Ўласа; «Сьмешны закон»—А. Паўловіча; «Доля жэбрака» — М. Арла; «Каму што», «Шчасьця Мацея»—Алеся Гаруна; «Залом у жыці», «Лекар ведзьмар». «Калядны вечэр» — Лявона Лобіка.

Імёны любленых нашымі чытамі аўтороў і вядомые ужо з «Н Н.» іх легенды-апаведаньня самі за сябе гаворуць і даюць паруку, што гэта кніжка будзе належаць да ліку найболей папулярных у народзе кніжэк.

6) Ўсевалад Гаршын «Сыгнал». (22 стр. 8⁰, ц. 5 к. Другое выданьне). Першае выданьне гэтай кніжкі выйшло у Маскве. Выдала «Сыгнал» группа студэнтоў беларусоў у 1891 гаду.

Усе кніжкі выданы прыгожа, на добрай матовай паперы і сваім скромным выглядам міла лашчуць вока і радуюць душу.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны

### Выстаўка.

14—15 мая у Глыбокім, Дзіс. пав. адбудзецца выстаўка коней і народнаго штукарства.

Апрача гэтаго адбудзецца выстаўка коней у Гродне, Новагрудку, Слоніме і Кобрыне. У Новагрудку выстаўка адбудзецца 23 мая, у Гродні 30 мая.

## З Міншчыны.

### Закрываньня карчэм.

У Новагрудзкім павеці у в. Старасельня, Новасады, Зялёнка, Запольле і інш. селяне пастанавілі пазачыняць прыватные шынкарні і манапольkі.

У вёсцы Стасевічах, Бабруйск. пав. замужніе кабеты склікалі вялікую сходу замужніх кабет і пастанавілі рабіць стараньня каб пазакрываць ва ўсей ваколіцы манапольkі і прыватные шынкарні (піўные, тракціры і інш.). Дзеля таго «што бязмернае пьянства руйнуе селянскую гаспадарку і шырыць буянства ды дзікасць звычаёў». Гэтак напісалі у сваей пастанове Стасевічоўскіе кабеты і пастанову гэту падпісало 150 кабет.

Добра было-б каб і па другіх вёсках кабеты рабілі сходы і змагаліся с пьянствам.

### Колькі слоў аб інструктарскіх курсах у Міншчыне.

Наш родны край, наша Беларусь, за апошніе часы сіліцца стануць поплеч з другімі старонкамі у справе экономічнаго і сельска-гаспадарскаго развіцьця. Бьецца, яна бедная, як рыба аб лёд, каб сваімі сіламі заваеваць, каб сваімі рукамі злавіць і прыцягнуць да сябе тую лепшую долю з якой, даўно ужо карыстаюць другіе народы.

Пачуцьце сваей народнасці ужо пасьпело пусціць карані сярод беларускаго народу. Цяпер лепшые людзі нашай старонкі стараюцца, як можна, падняць палепшыць экономічнае палажэньне краю. Яны зразумелі, што шчасьця народу беларускаго, яго лепшая доля не залежыць ад грубой сілы, а ад моцы народнай, яго сьвядомасьці і багацьця.

Наша Беларусь з яе пушчамі, рэкамі і лугамі дужа прыгодна да гадоўлі скаціны. Людзі агледзіліся, што у другіх краёх, дзе нават і не так прыгодны варункі, ды дзе людзьмі кіруе ахвота і вера у лепшую будучыну, яны сваей працай і еднасьцю патрапілі паставіць гэтак малочную гаспадарку, што яна сталася крыніцай народнаго багацьця. І вось у апошніе часы і у нас пачалі думаць аб гэтым. Хто можэ пасьцешае наладзіць у сябе малочную гаспадарку: падбірае лепшаго заводу на племя скаціну, пачынае лепей карміць і дагледаць яе—і раз хто пачаў працаваць у гэтым кірунку, той ужо ведае, якую карысць яму прыносе гэта. Дзеля таго, што меншые гаспадары ня могуць, кожны па асобку, рабіць вялікіх выдаткоў на інструктароў і інш., яны злучаюцца у таварыствы, наймаюць грамадой інструктара, каторы-бы вучыў, як трэба наладзіць малочную гаспадарку і даглядаў яе у даннай ваколіцы. Першы край с такімі таварыствамі і інструктарамі была Данія. З радасьцю можэм сказаць, што наша Беларусь ня доўга спала і цяпер хутка пасьпешае, каб дагнаць другіх, што, дзякуючы лепшым варункам іхняго жыцьця, паперэдзілі нас.

У гэтым гаду у Мінску адбыліся першые курсы інструктароў па малочнай гаспадарцы. Практыку яны знімалі у маёнтку ягомасьця Слатвінскаго, пад агульным кірункам вельмі шанаванаго, як шчыраго працоўніка над экономічным падняцьцем нашаго краю, мінскаго інспэктара па гадоўлі скаціны ягомосьця Рыхтэра. Годна увагі, што гэтые першые курсы скончыла, як інстурктар першая кабета — А. Туміловіч. Нэ пабаялася цяжкай працы часам труднай і неўдзячнай, а пашла туды куды клікало пачуцьце сэрца: палажыць сваімі рукамі цэгліну у фундамэнт гмаху нашай лепшай будучыны. Паміж іншымі гэтые курсы скончылі: К. Русецкі. Р. Новіцкі, А. Бялыновіч, І. Ковалеўскі, З. Родзевіч. Лейтон‘ Кернажыцкі, Барыс, Сідаровіч, Шацілло, Власавец, Мнішко, Колендо, Недзведзкі. Гэта першые людзі каторых наша міншчына убачыць як працоўнікоў дзеля еднасьці усіх жыхароў нашаго краю, дзеля лепшай яго будучыны.

Дай Божа шчасьця і многа сіл.

*Жылака.*

### Пажар.

У Паўловічах (Бабруйск. пав.) згарэло 14 дамоў і 56 халодных будынін. Страты на 10 тысяч руб.

### Ігумень.

29 красавіка тут здарылося гэткае нешчасьця Два хлопцы—Акуліч і Буза — пагналі за горад на выган пасьвіць гусей і Буза узяў с сабой стрэльбу сыстэмы Бэрдана. Там Акуліч пачаў раскладаць агонь, а Буза стаяў абапёршыся тварам на рулю стрэльбы. Увідзеўшы варону Акуліч стаў прасіць у сябрука стрэльбы, каб стрэліць у яе, але ён не даў. Тады Акуліч хацеў бытцым вырваць яе і неяк выстрэліў. Буза як стаяў абапёршыся на стрэльбу дык так і паваліўся мёртвым, бо ўвесь набой шроту праляцеў праз галаву. Бузу было гадоў каля 14, а Акулічу і таго німа.

= А нідаўна тут было ешчэ гэткае здарэньне. У вечэр — маскаль Кульбіцкі і татарын Якубоўскі, пашлі у лес на спацыр. У лесі Якубоўскі, нет ведама з якой прычыны, стаў нажом рэзаць Кульбіцкаго і зрабіў калі 10 ран. Пасьля сам-жэ Якубоўскі пашоў у паліцію, дзе яго знаёмые (ён там уперад служыў) сталі пытацца чаму ён у крыві. — Вун, ідзіця прыбярыця Кульбіцкаго: я яго зарэзаў». Яго арыштавалі.

**М. Г.**

## З Вітэбшчыны.

### Пажар.

У нядзелю 20 красавіка у дзень у Ушачы (Лепэльск пав.), узняўся раптоўны пажар. У кароткім часе агонь агарнуў усю сярэдзіну мястэчка. Ратаваць не было чым і як, бо нё было пажарнай стражы. Згарэло 48 дамоў і 40 крам.

# З усіх старон.

### Першае мая.

У Пецербурзі перад першым мая паліція зрабіла многа обыскоў: хацелі злавіць забастовачны камітэт. Усяго было больш 400 обыскоў, арэштавалі колькідзесятак работнікоў.

У дзень першаго мая ад 5 гадзіны раніцы уся паліція была на нагах. Каля мастоў праз Неву былі разстаўлены салдаты, на ўсіх перавозах праз Неву памножэны быў надзор рачной паліціі. Многа паліціі было разстаўлена у панадворках дамоў і каля трамваёў На вуліцах гэтак сама было многа паліцэйскай варты, каторая пільнавала каб работнікі не пэрэхадзілі на Неўскі

Першая дэмонстрація адбылася на выборгскай старане. Работнікі грамадой у 1500 душ рушылі вуліцай, спеваючы Марсэльезу, але конные гарадавые разагналі дэмонстрантоў.

На Пуцілоўскіх фабрыках баставалі усе майстэрні. Работнікі выкінулі чырвоны сцяг. Невядомы пачаў гаварыць прамову.

Апрача гэтаго на шмат якіх фабрыках былі мітынгі, пеяліся рэволюційные песьні і выкідываліся чырвоные сцягі. Найбольш шумнай была дэмонстрація на Вялікім праспэкці.

Усяго баставало першаго мая каля 230 тысяч работнікоў.

Адбыліся забастоўкі і па іншых гарадох; многа баставало работнікоў у Маскве.

### Нелегальная друкарня.

У Тыфлісе выкрылі тайную друкарню каторая друкавала першамайскіе прокламаціі. Арэштавалі 11 душ.

### Змаганьне з работнікамі.

Ёсць праект выдаць закон аб праве фабрыкантам увальняць бастуючых работнікоў без папярэджэньня і без двохтыднёвай пэнсіі.

### Змаганьня с пьянствам.

За апошніе два гады на разгляд варанежскаго упраўленьня акцызнымі зборамі надыйшло 56 прыгавароў аб закрыцьцю манапаляк. Усе прыгавары зацьверджэны і было закрыта 256 шынковень. За першые месяцы гэтаго году надыйшло 46 прыгавароў аб закрыцьцю манаполек і піўных, каторые такжэ зацьверджэны.

### Крадзеж.

У Кіеві два почтальёны, што прывозілі почту з вагзалу, разрэзалі па дарозі скураные мяшкі і украўшы пакет с 32 220 рублямі уцяклі.

# Жарты.

Хлопчык да хлебніка:

— Адважця, дзядзьку, тры фунты хлеба!

— Якога: белага ці чорнага?

— Усё роўна, — гэта для сьляпога.

---

Маскаль атслужыўшы сваю службу, вярнуўся у родную вёску.

— Ці добра-ж, — пытаюцца, — служыць было?

— Добра. Блізка усю Расею абхадзіў. Усюды быў, уселякаго дзіва нагледзіўся... От, прымерна, на Чорным моры.. Морэ дзіўнае!

— Чым-жэ гэта?

— А тым што чорнае. Ботаў чысціць ня трэба. Такое яно чорнае, што боты толькі спаласьні ў ім—і ў той час вымай, гатовенькіе, усё роўна як вычышчэные самай лепшай ваксай.

— Бачыш, а-а-а!

**М. Г.**

Рэдактар І Луцэвіч.
Выдавец А. Уласоў.

Фосфорытны завод
ІВАНА ВАСІЛЬЕВА
Ст. Сешчынская Р. О. ж. д.
суліць на удабрэньня палеў, сенажацеў, садоў і гародоў
фосфорытную муку з глаўканітных фосфорытоў, маючую у сабе ад 12 да 16% фасфорнай кіслаты і да 30% калі.
**Тэрмосфат з абпаленых фосфорытоў маючы у сабе ад 18 да 23% фосфорн. кісл. 75% распушчаемасці. Прэйс-куранты рады і отзывы безплатна.**

! Апошняе напомненьне !!
Даступна кожнаму
**купіць вучастак зямлі у ЗВЯРЫНЦЫ** у самай лепшай часці гор. Вільні. Мейсцовасць прыгожая, здаровая, лес, рэка. **Цэны і варункі выгодные. С купляй паспешайця,** зямлі асталася заўсім мала! **РУПЦЕСЯ — купіць можэця толькі у гэтым сэзоне.** Па спраўкі звертацца у кантору па прадажы вучасткоў у Зьвярынцы: Вільня **„Звярынец“**, Георгіеўскі праспэкт, д. № 68. Тэл. № 46. **Спраўкі выдаюцца праз цэлы дзень, не вылучаючы і сьвят.**

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.